Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2021-11-19

**даніна памяці**

# Даследаваў культуру моў



Беларускі мовазнавец Арнольд Міхневіч 9 верасня адзначыў бы 85-годдзе. Пасля заканчэння Гомельскага педагагічнага інстытута ён працаваў у Інстытуце мовазнаўства АН Беларусі. У 1977 годзе стаў доктарам філалагічных навук, а ў 1980-м — прафесарам. Шчыраваў у Інстытуце паліталогіі і сацыяльнага кіравання, быў прарэктарам і загадчыкам кафедры Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта. З 1995 года — у Інстытуце праблем культуры, з 1998 года — яго рэктар, адначасова загадваў кафедрай сучаснай беларускай мовы на філалагічным факультэце БДУ.

Даследаваў пытанні граматыкі, лексікалогіі, этымалогіі беларускай мовы, культуры беларускай і рускай моў, параўнальнай і сацыяльнай лінгвістыкі, рыторыкі і культуралогіі.

Навуковая грамадскасць ведае яго працы. Сярод іх — «Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове», «З гісторыі прамоўніцкага мастацтва», «У глыб слова чалавечага», «Мова, якой няма» і інш.

Арнольд Міхневіч быў суаўтар «Слоўніка славянскай лінгвістычнай тэрміналогіі», «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы», «Беларуска-рускага паралексічнага слоўніка-даведніка», «Англа-беларускага размоўніка», кніг «Грамадства — мова — палітыка», «Беларуская мова для тых, хто гаворыць па-руску», «Культура мовы ў пытаннях і адказах», «Беларуская мова: Энцыклапедыя». За апошнюю атрымаў Дзяржаўную прэмію Беларусі.

Памёр Арнольд Яфімавіч летась. Ганаруся сваім знаёмствам з ім. У 1998—1999 гадах працаваў у Беларускім інстытуце праблем культуры, якраз тады рэктарам быў спадар Міхневіч — тактоўны, добрасумленны і адукаваны кіраўнік.

**Аляксей ШАЛАХОЎСКІ**

Аляксей Шалахоўскі. Даследаваў культуру моў